**ДАСЦІ́ПНАСЦЬ**, уменне выказацца востра, смешна, даць трапнае азначэнне; таксама трапнае, афарыстычнае выказванне аўтара, думкам якога ўласцівы парадаксальнасць, вынаходлівасць і на падставе знаходжання пэўных асацыятыўных сувязей паміж далёкімі паводле сэнсу словамі, або яркага гукавога афармлення яны выклікаюць эфект нечаканасці і нават камічнасці. Д. вылучаецца інтэлектуальным асяроддзем бытавання і ад інш. відаў камічнага адрозніваецца тым, што, па словах Арыстоцеля, «камічнае знаходзяць, а дасціпнае ствараюць». Дасціпнае сустракаецца ў мове асобных персанажаў і характарызуе іх са станоўчага або адмоўнага боку. Вылучаецца асобны жанр — досціп, які бытуе ў культуры розных народаў, у т.л. і бел. «Жыццё — надта небяспечная хвароба, бо той, хто жыве, у рэшце рэшт памірае» (С.Е. Лец); «Дурань таму і блішчыць здалёк, што знаходзіцца не на сваім месцы» (К.Крапіва). *В.І.Еўмянькоў.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова